МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МАЗЫРСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ



# ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫІ, НАВУКІ, КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

**МАТЭРЫЯЛЫ**
**Міжнароднай навуковай канферэнцыі**
**( 22-23 лістапада 1996 года, г. Мазыр)**

**Частка І**

Мазыр 1996

візны, бо ў падобных кантэкстах сустракаюцца і ў іншых аўтараў, то апошнія вершавання радкі — творчая знаходка паэта. Усведамляючы віну сучаснікаў у пагаршэнні экалагічнага стану Палесся, нібыта прадчуваючы, што яна стане яшчэ большай пасля Чарнобыльскай катастрофы, паэт параўноўвае гэту віну з кругамі на вадзе і спадзяецца, што бог усё ж пастараецца дапамагчы не дакаціцца гэтым кругам да нашчадкаў.

Свежымі метафарычнымі вобразамі аздабляюць верш і выразы "жылка крыніцы", "жыцця берагі" /параўн. прамыя значэнні лексем жылка і берагі ў спалучэннях "жылка на твары", "берагі ракі"/.

Істотнай прыкметай паэтыкі В.Віткі з'яўляецца багацце эпітэтаў у мастацкай сістэме яго твораў. Гэты абавязковы ў паэзіі троп займае сталае месца ў даследаваным вершы, выступаючы ў якасці азначэнняў і перад назоўнікамі, і пасля іх, часам нанізваючыся ў адзін ланцужок і ствараючы багатую кантэкстуальную сінанімію: крутых камяніц, у цёплым гняздзе, чапля пыбатая, легкакрылая ракета, устрывожаны ўскрык, жаласны, роспачны плач, Прыпяці вольная шыр, мілы Мазыр.

Эмацыянальна-сэнсавую змястоўнасць набываюць у В.Віткі эпітэты колераабазначэння: з сіняй смугі, белая чаіца, схілы зялёныя. Маючы ў паэтычнай мове традыцыйны характар, яны ў вершы "Па дарозе ў Мазыр" выступаюць як сімвал чысціні, прыгажосці палескай прыроды, якую неабходна берагчы.

Як вядома, вельмі пашыраным і ў мове гутарковай, і ў мове мастацкай прыёмам раскрыцця думкі з'яўляецца параўнанне. В.Вітка карыстаецца гэтым прыёмам асцярожна, у выпадках, калі патрэбна больш канкрэтна, наглядна, вобразна паказаць прадмет, з'яву, дзеянне, раскрыць думку, пачуццё. У мастацкі тэкст аўтар уводзіць параўнанні пры дапамозе злучнікаў як, быццам, нібы. Аб назіральнасці мастака слова, яго здольнасці бачыць падабенства там, дзе звычайны чалавек, можа, яго і не заўважыў бы, сведчыць ужыты ў даследаваным вершы параўнальны зварот "быццам на крыжа яна ў ледалом, на каляровым крузе плыла", што дае ўяўленне аб становішчы чайкі, якая сядзіць на бакене і ніяк не можа ўзляцець.

Разгледжаныя стылістычныя асаблівасці складаюць толькі невялікую частку выяўленчых сродкаў, уласцівых паэтычнай мове В.Віткі. Але нават гэты абмежаваны матэрыял паказвае, наколькі важную мастацкую ролю можа выконваць слова, калі яно выкарыстоўваецца сапраўдным знаўцам мовы.



В.С.Болбас
Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут

# М. В. ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ АБ ВЫХАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ БЕЛАРУСАЎ

Сярод выдатных айчынных народазнаўцаў XIX стагоддзя пачэснае месца належыць выпускніку Мазырскай прагімназіі Мітрафану Віктаравічу Доўнар-Запольскаму. Менавіта ў Мазыры была распачата навукова-даследчая дзейнасць знакамітага фалькларыста і этнографа.

Адзначаючы шматграннасць навуковых інтарэсаў і грунтоўнасць даследчых падыходаў М.В.Доўнар-Запольскага трэба заўважыць, што практычна ўсе яны ў рэшце рэшт зліваліся ў агульнае рэчышча, якое скіроўвала творчы геній вучонага да адной з самых набалелых праблем свайго народа — развіцця этнічнай самасвядомасці і нацыянальнага самавызначэння.

Адметная асаблівасць выдатнага народазнаўцы заключаецца ў тым, што, глыбока вывучаючы гісторыю свайго краю, ён навукова абгрунтаваў ідэю аб магчымасці і неабходнасці існавання на планеце беларускай нацыі як роўнай сярод роўных. Больш таго, М.В.Доўнар-Запольскі лічыў, што ўсё чалавецтва павінна быць зацікаўлена ў захаванні гэтай людской супольнасці, якая, як пераконваў этнограф, засталася адной з самых чыстых у славянскім свеце. Ён супакойваў песімістаў, даказваючы, што пазбаўленне народа палітычнага жыцця, сацыяльны і нацыянальны прыгнёт яшчэ не знішчаюць галоўных этнавызначальных прызнакаў і, асабліва, калі не страчана родная мова, пры пэўных абставінах, народ адраджаецца зноў. Навуковыя працы вучонага ахопліваюць практычна ўсе перыяды гісторыі беларусаў, але вышэйадзначаная яго скіраванасць садзейнічала таму, што перыяд існавання беларускай дзяржаўнасці з асаблівай сілай прыцягваў увагу даследчыка, бо даваў яму ўсё новыя і новыя аргументы ў абгрунтаванні правоў нашага народа на самастойнае існаванне, на будаўніцтва сваёй нацыянальнай дзяржавы.

М.В.Доўнар-Запольскі лічыў, што вызначальным кампанетам і характарызуючай прыкметай этнічнай супольнасці беларусаў сярэднявечча была самабытная духоўная культура. Яе устойлівыя асаблівасці і адметнасці спарадзілі ўсталяванне ў прадстаўнікоў нашага народа такіх рыс і якасцей, якія сталі характэрнымі спачатку для беларускага этнасу, а потым вызначальнымі для беларускай нацыі. Іх сукупнасць уяўляла сабой неацэнны скарб этнічнай і нацыянальнай свядомасці нашых супляменнікаў.

Важным элементам духоўнай культуры, яскравым паказчыкам развіцця этнічнай самасвядомасці з'яўляецца нацыянальны патрыятызм —

любоў да свaей радзімы, да свайго народа. М.В.Доўнар-Запольскі разумеў, што фармаванню гэтай грамадска-маральнай якасці павінна ўдзяляцца пільная ўвага. Не выпадкова, ён дэталёва даследуе дзейнаць і погляды аднаго з выдатных сцяганосцаў нацыянальнага патрыятызму Васіля Цяпінскага. Мітрафан Віктаравіч згаджаецца з айчынным асветнікам, што вытокі дэградацыіі духоўнага быцця, нацыянальнага нігілізму — у невуцтве і бескультурнасці. Яму вельмі імпанавала імкненне дзеяча беларускага Адраджэння быць практычна свайму народу "услугуючым". Таму ён лічыў, што грамадска-патрыятычная і нацыянальная свядомасць кожнага чалавека павінна быць сацыяльна актыўнай, падпарадкаванай ідэі рэальнага служэння інатарэсам людзей.

Характэрна, што патрыятычна-выхаваўчыя накірункі у педагагічнай думцы Беларусі не дапускалі нацыянальнай фанабэрыі, пыхлівасці, знявагі да іншых народаў. М.В.Доўнар-Запольскі выдзяляе словы В.Цяпінскага, дзе той падкрэсліваў, што беларусы—гэта толькі частка "зацной монархии словенской".

Навуковы аналіз надзвычай багатага фальклорнага матэрыялу дазволіў М.В.Доўнар-Запольскаму даволі дакладна ўстанавіць найбольш тыповыя рысы і якасці беларусаў, такія, як незлаблівасць, талерантнасць, памяркоўнасць, чалавечнасць, дабразычлівасць, стрыманасць, цярплівасць, міралюбнасць, беражлівасць, карпатлівасць, даверлівасць, уражлівасць, гасціннасць і інш. На думку этнографа, існуе толькі адзіная рыса, якая з нявыгаднага боку характарызуе беларуса – гэта п'янства.

У той жа час даследчык прыходзіць да высновы, што беларускаму народу ўласцівы такія рысы, як пачуццё уласнай годнасці, стойкасць, мужнасць, упартасць, якія у пэўныя часы могуць нават выцесніць на другі план мяккасць характару. Менавіта з гэтымі якасцямі беларусаў звязваў Мітрафан Віктаравіч будучае адраджэнне роднага краю. Вучоны лічыў, што ў значнай ступені вобраз цёмнага, забітага, паслухмянага беларуса штучна ствараўся рускім царызмам у палітычных мэтах. У той жа час ён даваў адмоўную характарыстыку як русіфікацыі, так і паланізацыі беларускіх зямель.

Сённяшнія палітыкі і педагогі, якія клапоцяцца аб выхаванні нацыянальнай самасвядомасці нашых людзей, павінны ўзяць на ўзбраенне наказ М.В.Доўнар-Запольскага, у якім ён пераканаўча даказваў, што чым вышэй стаіць грамадства, тым больш свабодна ў маральных, інтэлектуальных і сацыяльна-палітычных адносінах знаходзіцца ў ім кожны індывід. А чым больш разнастайнае і свабоднае жыццё індывіда, тым інтэнсіўней грамадства рухаецца на шляху свайго развіцця.



И.А.Варнина
Мозырский государственный педагогический институт

# РЕГИОНАЛЬНАЯ ОСНОВА "ПОЛЕССКОЙ ХРОНИКИ" И.МЕЛЕЖА И "ПОДНЯТОЙ ЦЕЛИНЫ" М.ШОЛОХОВА

Стремясь к постижению творчества того или иного писателя,очень ажно,на наш взгляд,учитывать местные,региональные особенности,имещиеся в его произведениях. Естественно,что использование писателем егиональных элементов не должно быть самоцелью,а придавать его произведениям своеобразный национальный колорит. Обращаясь к "Полесской ронике" И.Мележа и "Поднятой целине" М.Шолохова,легко можно убедиться в региональной основе этих произведений. Сравнение региональных собенностей произведений И.Мележа и М.Шолохова интересно в том плае,что позволяет выявить наиболее характерное в людях,живущих на Доу и Белорусском Полесье.

Если обратиться к трилогии И.Мележа,то её региональная основа одтверждается словами самого автора:"Буквально каждый лесок,каждая ропа,гребля,которую строил Миканор...,дорога на Юровичи,место,где ыла ярмарка,--всё это мной не придумано. Можно сказать,живьём вошёл произведение и другой жизненный материал,например,утро в Куренях, ыезд на сенокос и т.д." [I] Вообще,как следует из трилогии,быт Белоусского Полесья воссоздан в ней с почти этнографической точностью. а страницах "Полесской хроники" перед нами своеобразный деревенкий мир,пропитанный национальными традициями,преданиями и старинны и поверьями. Сюда очень органично входят зимние посиделки,молодежые игрища,рождественские гадания,хождения с "козой" и т.д. Дается то для того,чтобы наиболее полно воссоздать жизнь,нравы,мироощущеие белорусского крестьянства.

Сопоставляя "Полесскую хронику" и "Поднятую целину",можно увиеть,что русский и белорусский писатели,раскрывая характеры своих героев,используют ряд сходных приёмов и художественных средств. Однако роизведения при этом не теряют своей национальной специфики. Об том свидетельствуют,например,пейзажные зарисовки,язык героев и т.д. нализ сцен утреннего пробуждения Гремячего Лога/т.5,гл.I9/ и Куреней т.I,гл.I/ наглядно подтверждает,как М.Шолохов и И.Мележ передают национальный колорит быта донского казачества и полесского крестьянства. Следует подчеркнуть,что оба писателя хорошо передают своеобразие ационального пейзажа/вспомним,например,I9-ю главу из I-й книги "Поднятой целины" и 3-ю главу из 2-й части романа "Дыхание грозы"/.

В "Поднятой целине" и "Полесской хронике" важную роль в раскрыти